# С Е К Ц Ы Я 4
# КЛАСІЧНАЯ ЛІТАРАТУРА
# Ў СУЧАСНЫМ ПРАЧЫТАННІ

***Т. М. Тарасава***

## ДОМ – БЯЗДОМНАСЦЬ – АНТЫДОМ У ТВОРЧАЙ СПАДЧЫНЕ ЯНКІ КУПАЛЫ І ЯКУБА КОЛАСА

Паняцці *дом/сям'я/радавое гняздо* адносяцца да самых старажытных і знакавых у культуры і свядомасці чалавека. Ю.М. Лотман называе *дом* і ўніверсальным архетыпам сусветнага фальклору [5]. *Дом* як ментальная свядомасць народа найбольш складаны ў трактоўцы: можна гаварыць пра д*ом* Нябесны, які яднае чалавека з Космасам, Сусветам, Богам; *дом* душы, дзе дамінуюць духоўныя кампаненты. У паняцці *дом* вылучаюць матэрыяльны аспект (збудаванні, гаспадарка) і духоўны (спалучэнне маральна-этычных фактараў). Безумоўна, гэтыя два аспекты ўзаемазвязаны, але найбольш складаным у трактоўцы выступае духоўны кампанент *дома*. Менавіта маральны аспект у пабудове *дома* вызначае яго матэрыяльны бок. У адпаведнасці з духоўнай традыцыяй беларусаў *дом* закладвае маральны падмурак выхавання дзяцей, павагі да бацькоў, іх шанавання, *дом* выступае ахоўнікам, абярэгам усіх яго насельнікаў. У пісьменніцкім творы канцэпт *дом* атрымлівае статус мастацкага. З аднаго боку, ён выяўляе аўтарскую філасофію, а з другога, сам фарміруе мастацкі свет твора.

У творчай спадчыне Янкі Купалы і Якуба Коласа *дом* увасабляе ментальную свядомасць народа і выступае як шматпланавы канцэпт, які аднолькава важны для кожнага. Невыпадкова іх пісьменніцкія трактоўкі шмат у чым блізкія і апіраліся найперш на фальклорную традыцыю. *Дом* для Купалы і Коласа – гэта сялянская хата, з ёю звязаныя народныя ўяўленні аб светабудове. *Дом* як духоўнае прыстанішча (*дом* душы) – важны структураўтваральны элемент мастацкай карціны свету беларускіх песняроў. Гэта і сямейна-роднасныя стасункі, і сацыяльна-гістарычная прастора жыцця, і еднасць чалавека з Сусветам.

Самым важным для Якуба Коласа з'яўляецца ўспрыняцце *дома* як **духоўнай** прасторы чалавека, якая вызначае адносіны герояў да сям'і, да народу, яго гісторыі. Апісанне дома-будынкаў досыць распаўсюджана ў пісьменніка. Прыгадаем радкі з “Новай зямлі”:*“У дол упёршыся страхою. // У глыбі двара стаяла хата // І выглядала зухавата… // Як бы шляхцянка засцянкова, // Што ў дзень святы каля касцёла, // Чуць-чуць падняўшы край падола, // Так важна ходзіць з парасонам, //*

*Спадніцай верціць, як агонам, // З дарожак пыл, пясок зганяе // І ў вочы хлопцам заглядае"* [1, с. 12].

З *домам* у творах Янкі Купалы і Якуба Коласа звязана праблема свабоды, як сацыяльнай так і **духоўнай**. Праблема духоўнай свабоды ніколі не губляе сваёй актуальнасці яшчэ і таму, што мае дачыненне не толькі да асобы чалавека, але і да грамадства. Свабода – катэгорыя дуалістычная (з'яўляецца адначасова "станоўчай" і "адмоўнай") і спалучае ў сабе два ўзаемаперацякальныя пачаткі – дабро і зло. Яе дуалістычнасць найглыбей выяўляецца ў вобразах Міхала з "Новай зямлі" Якуба Коласа, Сымона Зябліка з "Раскіданага гнязда" Янкі Купалы. Парадаксальнасць духоўнай свабоды герояў у рэальным жыцці праяўляецца ў цалкам палярным адрозненні паміж тым, чаго яны жадаюць, і тым, што атрымліваюць. Гэта абумоўлена духоўнай непадрыхтаванасцю суб'ектаў: зададзенай мэтай без уліку ўсіх абставін часу.

Беларускія класікі сутнасць асобы бачаць менавіта ў духоўным жыцці, якое вызначаецца маральным выбарам, імкненнем да дабра і непрыманнем зла. У жыцці кожнага чалавека заўсёды цесна пераплятаюцца дабро і зло. Беларускіх мастакоў цікавіць, як герой робіць свой выбар і ці парушае пры гэтым маральны закон. Маральныя выпрабаванні, праз якія праходзяць Міхал (Я. Колас "Новая зямля"), Сам (Я. Купала "Сон на кургане") падымаюць іх на больш высокую ступень духоўнага развіцця.

Клопат аб набыцці дому/зямлі маральна загартоўвае Міхала ("Новая зямля"), што дае яму адчуванне ўнутранай свабоды і права перайначыць свой лёс. Свядомасць героя як праяўленне яго духоўнай сутнасці ўмацоўвае ў ім пачуццё адказнасці за лёс сямейнікаў, за душэўны камфорт дома, жаданне самому вызначаць жыццёвы шлях. Але свабодныя духоўныя памкненні Міхала Якуб Колас звязаў з прычынна-выніковымі сувязямі рэчаіснасці, якая жорстка стрымлівала героя: *"Так, многа клопатаў з зямлёю! // Як цяжка голаю рукою // Рабіць, вясці такія справы! // І больш той гутаркі і славы, // І гэтай зайздрасці і плётак // Дзядзькоў дасужых і іх цётак // І ўсіх наогул сваякоў, // Бо чалавек ужо такоў, – // Ну, больш галасу, чым карысці. // Ох, цяжка, цяжка ў людзі выйсці // І моцна стаць на свае ногі, // Бо многа ў свеце вас, парогі"* [1, с. 284–285]. Такім чынам, Якуб Колас у "Новай зямлі" арганічна спалучыў праяўленне свабоды свядомасці і яе дэтэрмінаванасць.

Пісьменнік пакідае за Міхалам права свабоднага выбару жыццёвага шляху. Міхал свядома ставіць перад сабой мэту, свядома спрабуе яе ажыццявіць, і нават у неспрыяльных сацыяльных абставінах герой духоўна развіваецца, бо ён робіць маральны выбар, і гэты выбар на дабро для сваёй сям'і: *"Каб цень развеяць тае смуты: // – І трэба часам крыж пакуты // Панесці, мілыя мае вы, // Зазнаць і гора, неспадзевы! // Але раз ты наважыў дзела, // Ідзі станоўча, роўна, смела, // Ідзі, назад не аглядайся // І на другіх не пакладайся!"* [1, с. 285–286].

Мастацкая літаратура ніколі не абмінала пытанні ўзаемазалежнасці ўнутранага жыцця чалавека і знешняга асяроддзя. Вядома, што затворніцтва, адзінота актывізуюць унутранае жыццё, але яго актывізуюць і вандроўкі, паломніцтва. Па гэтай прычыне *дом* толькі як фізічная прастора існавання чалавека не з'яўляецца вырашальным фактарам у духоўным самавызначэнні асобы, тут

хутчэй варта гаварыць пра больш тонкія трансфізічныя параметры прасторы, якія вызначаюць выбар духоўных перспектыў і ўнутранае самаўдасканаленне.

Трагічнай наканаванасцю чалавечага існавання выступае *бяздомнасць.* Трагічнай – калі ўспрымаць *бяздомнасць* як альтэрнатыву страчанаму дабрабыту. Але *бяздомнасць* можа быць і новым жыццём, новымі схаванымі магчымасцямі і нечаканымі радасцямі. Яна актывізуе ўнутранае жыццё чалавека. *Бяздомнасць* можна ўспрымаць і як добраахвотнае жаданне выйсці за межы дома ў адкрыты свет дзеля выпрабаванняў духу, пашырэння прасторавых межаў быцця і свядомасці (Адысей, Дон Кіхот, Дон Жуан, Фаўст, Чайльд Гарольд, Рабінзон Круза і інш.).

*Бяздомнасць* у беларускай літаратуры – гэта часцей за ўсё з'ява негатыўная, бо з ёй звязаны сацыяльныя беды, страта веры, роднага кута. Але Купала і Колас тут бачаць не толькі адзін негатыў, у *бяздомнасці* ёсць і пазітыў. Беларускія мастакі слова, пісьменнікі з філасофска заглыбленным разуменнем свету, трактуюць *бяздомнасць* як экзістэнцыяльна-метафізічную перспектыву новага жыцця з новымі радасцямі і магчымасцямі чалавека (“Раскіданае гняздо” Янкі Купалы, “Сымон-музыка” Якуба Коласа). Для герояў “Раскіданага гнязда” *бяздомнасць* – разгубленасць, страта веры, глебы пад нагамі, прычына сацыяльных бед сям'і. І ў той жа час у *бяздомнасці* герояў Я. Купала схільны бачыць актывізацыю іх унутранных памкненняў перайначыць жыццё, свой лёс, перамагчы абставіны. Шляхі-дарогі Сымонкі (“Сымон-музыка”), якімі вядзе Я. Колас свайго героя, пашыраюць межы чалавечага быцця і свядомасці. А вяртанне да Ганны, да дому, дэманструе анталагічнае адзінства пачатку і канца, загадкавую еднасць нараджэння і смерці. Паміж гэтымі палюсамі шматаспектнае жыццё чалавека.

*Дом* у літаратуры, як вядома, выступае сімвалам стабільнасці, надзейнасці, абароненасці, выклікае пачуццё далучанасці да сям'і, роду, *дом* — гэта яшчэ і сімвал цэласнасці быцця. Але чалавек можа ператварыць *дом* у псіхалагічна небяспечны вобраз, па сутнасці, *дом* становіцца *антыдомам,* як гэта адбылося ў апавяданні Якуба Коласа “Хатка над балотцам”, а траўматычнае ўспрыняцце Сымонам-музыкам (паэма “Сымон-музыка”) бацькоўскага дому справакавала ўцёкі хлопчыка. Бяздомнасць Сымона, яго бадзянні па чужых дамах становяцца канцэптаўтваральнымі ва ўсіх варыянтах паэмы.

*Антыдом/псеўдадом* – асяродак разбурэння інтымна-прыватнага жыцця чалавека. Прыгадаем малюнак недагледжанай хаткі з апавядання “Хатка над балотцам”: *"Калі пазіраеш здалёк на гэтую хатку, на яе адзінокую постаць і на маленькі хлевушок, што прытуліўся да яе, бы дзіця да маткі, то нейкі мімаволі ўстае вобраз пакрыўджанай жанчыны, што пайшла ўпрочкі з сяла і ў невясёлым роздуме спынілася на дарозе сярод поля. <...> Стромкая страха яе абвісла, паздзірана вятрамі, і лезе салома з яе, як валасы з галавы, апанаванай горам, клопатам, бядой-згрызотамі"* [2, с. 177]. Закінутыя будынкі – гэта папрок чалавеку, які занядбаў сядзібу і ператварыў яе ў ілюзію прытулку. Дакладнае апісанне знешняга выгляду хаткі наводзіць чытача на думку аб яе гаспадарах. Ніхто з жыхароў не меў тут удачы, зазначае Колас, бо сапраўднымі гаспадарамі яны не былі. Хатка для іх – проста будынкі, а не *дом* у шырокім сэнсе гэтага паняцця.

У апавяданні Я. Коласа выразна гучыць тэма *дому* сямейнага, духоўнага як *дому* ілюзорнага, лялечнага, страчанага: *"Думае Алена часамі, як будзе жыць далей.*

*Тры мясціны ёсць на свеце, дзе можна яшчэ прыпыніцца: прыгрэбнік, вёсачка і горад. Але прыгрэбнік, як паказала мінулая ноч, рэч небяспечная. У вёсачцы можна начаваць толькі зрэдку. У горадзе ў яе ёсць сваякі. Часамі яна і жыве там. Але ж усё гэта – часовыя прыпынкі, сталага месца няма"* [2, с. 204–205].

Разбураны *дом* у Я. Коласа становіцца той канцэптаўтваральнай дэталлю, якая вызначае неўладкаванае светаадчуванне герояў, іх маральную некамфортнасць. Хатка над балотцам выяўляе ўсе прыкметы *антыдому*, тут пануе запусценне і галеча, і ўсе яе жыхары – фактычна бяздомныя людзі.

Адчувае сваю беспрытульнасць і Марыся, гераіня апавядання "Туды, на захад!". Успаміны жанчыны пра дом на Беларусі яднаюць усіх сямейнікаў: *"А дом які быў! – не можа стрымацца і Марыся: – прасторны, мураваны. На дзве палавіны быў зроблены. Уваднэй самі жылі, другую выпускалі пад школу. Цэлае вучылішча змяшчалася, шэсцьдзесят рублёў арэнды плацілі за зіму"* [2, с. 158].

Анамальным бачыцца Я. Коласу працэс разбурэння *дому-душы* настаўніка Рыгора Андрэевіча Угодніка з апавядання "Курская анамалія": *"У яго [Рыгора Андрэевіча Угодніка – Т.Т.] пакойчыку было пуста, няветла і непрытульна. Дух стаяў спёрты і цяжкі. Было холадна і сыра. Пабелка на сценах размякла ад вільгаці і адвальвалася. На выступах сцен нагусцілася многа пылу. Над печчу, каля столі, цэлымі кудламі звісала павуццё, у якім гойдаўся шкілет мухі"* [3, с. 372]. Побытавая дэталь сведчыць аб душэўных трывогах героя-інтэлігента наконт новага светаўладкавання. Духоўная анамалія грамадства, якое лічыць прыстойным кантраляваць сферу сямейных адносін асобы, пазбаўляць яе права выбару і адказнасці за яго, паводле думкі Коласа, будзе куды больш сур'ёзнай, чым проста бытавая неўладкаванасць.

Канцэпты *дом* і *сям'я* ў славянскай свядомасці, як вядома, цесна ўзаемазвязаны, што значна падвышае статус *дома.* Менавіта сям'я выступае арганізатарам і носьбітам духоўнага жыцця, яна ажыццяўляе сувязь чалавека з навакольным светам. Духоўны свет *дому-сям'і* ў кантэксце неспрыяльных сацыяльных фактараў XX ст. характарызуецца адсутнасцю адчування агульнага кораня паміж блізкімі людзьмі. Тэндэнцыя, на думку Янкі Купалы і Якуба Коласа, вельмі небяспечная для дзяржавы, бо яна вядзе да разбурэння радавых сувязяў і дэвальвацыі гуманістычных маральных каштоўнасцей. Не выпадкова так скрупулёзна выпісвае Колас быт і ўнутраную атмасферу *дому-сям'і* Міхала з "Новай зямлі", беспрытульнасць Сымона-музыкі (паэма "Сымон-музыка") і яго імкненне да Ганны як магчымасць набыць падмурак для пабудовы агульнага духоўнага *дому.* У мастацкім свеце беларускага пісьменніка адбываецца сакралізацыя *дому,* здольнага супрацьстаяць знешняму хаосу.

Прыгадаем апавяданне "Балаховец" Я. Коласа. Рашэнне Бадзейкі вярнуцца дадому, аддаўшыся ў рукі савецкай уладзе цаною жыццяў іншых людзей, спраўдзілася. Бальшавікі даравалі яму ранейшыя грахі, але ўласнага пакаяння не адбылося, не аказалася межаў у свядомасці самога чалавека. І *дом* аказаўся *антыдомам.* Гэта і вызначыла канчатковае падзенне героя, час стаў адзіным галоўным Суддзёй, і з ім вядзе дыялог Іван Бадзейка: *"Мой тэрмін сышоў. <…> Пара ўжо мне зямлю гнаіць, а я жыву яшчэ…"* [2, с. 265].

Доўгая дарога дадому не прывяла героя да набыцця душэўнага, духоўнага прытулку *(“Вёска і дом, павабныя ў думках, калі быў далёка ад іх, пазіралі цяпер на яго панура і няветла”* [2, 351–352]), родны калісьці дом стаў апошнім часовым трагічным прыстанішчам на бацькоўскай зямлі, якой ён даўно здрадзіў і выракся. Сюжэтную лінію заляцанняў да Аўдолькі не варта ўспрымаць як меладраматычны любоўны трохкутнік, яна ёсць лагічнае завяршэнне доўгага сюжэта самазабойства, самаліквідацыі героя. Парог сенцаў дома стаў той матэрыялізаванай мяжой паміж Бадзейкам і людзьмі, якая здольна выяўляць сутнасць быцця, яго глыбінныя першаасновы.

У *антыдом/псеўдадом* ператварыў сваю мінскую кватэру Мікіта Зносак з п'есы Янкі Купалы “Тутэйшыя”. Прастора *псеўдажылля* Зносака запоўнена рознымі прадметамі: *“Мікітавы пакой. У беспарадку накідана ўсякіх хатніх рэчаў... Шпалеры павыдзіраны і кускамі звісаюць к долу. Абразы і малюнкі ... перавернуты тварам да сцяны. Па ўсіх свабодных мясцох расклеены па сценах друкаваныя ўрадавыя пастановы, дэкрэты, лозунгі, загалоўкі тагачасных газет, плакаты. Вісіць балалайка”* [4, с. 302]. Варожасць *антыдома* відавочная, яна не абараняе і не аберагае героя, і чарговая авантура Мікіты заканчваецца арыштам. Такім чынам прастора *антыдома* выштурхнула героя за свае межы.

Канцэпт *дому* асацыятыўна шматвектарны ў творчасці мастакоў слова. Ён арганізуе духоўны свет чалавека, раскрывае яго надзейнасць, сумленнасць, здольнасць умела і дбайна працаваць. Для беларускіх класікаў заўсёды была важнай знітаванасць зямлі, дому і індывідуальнай адказнасці чалавека за іх.

**Літаратура**


1. Колас, Я. Збор твораў : у 20 т. / Я. Колас ; рэдкал.: М.У. Мясніковіч і інш. ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – Т. 8 : Паэма “Новая зямля” / рэд. М.І. Мушынскі ; падрыхт. тэкстаў і камент. Э.А. Золавай. – 347 с.
2. Колас, Я. Збор твораў. У 20 т. Т. 6. Апавяданні (1925–1951),раннія празаічныя творы (1900–1906), пераклады (1907) / Якуб Колас ; рэд. тома С.А. Андраюк, Т.С. Голуб ; падрыхт. тэкстаў і камент. К.А. Казыра, В.У. Карачун, А.І. Шамякінай ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 574 с.
3. Колас, Я. Збор твораў. У 20 т. Т. 5. Апавяданні (1906–1924) / Якуб Колас ; рэд. тома З.У. Драздова ; падрыхт. тэкстаў і камент. С.Я. Забродскай, К.А. Казыра, Т.Р. Строевай, А.І. Шамякінай ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 542 с.
4. Купала, Я. Збор твораў. У 9 т. Т. 7. Драм. Паэмы і п'есы / Янка Купала ; рэд. тома П.В. Васючэнка ; падрыхт. тэкстаў і камент. Э.А. Золавай. – Мінск : Маст. літ., 2001. – 399 с.
5. Лотман Ю.М. О поэтах и поэзии: Анализ поэтического текста: Статьи и исследования. Заметки. Рецензии. Выступления / Ю.М. Лотман. – СПб.: Искусство-СПБ, 1996. – 846 с.